Інфармацыйная культурна-грамадская газета Гарадоччыны

# ГАСЦІНЕЦ

№ 9 (71), КАСТРЫЧНІК 2008 ГОДА

**Цытата**
**Калі народ жадае, каб яго падманвалі, то хай ён будзе падмануты.**
**Карло Карафа, кардынал**

# БАНДЫЦКІ ПАЧАТАК УЛАДЫ?

Падаецца, ужо гісторыя раставіла ўсе кропкі над І. Адукаваным людзям даўно зразумела, што кастрычніцкі пераварот ( а яго самі бальшавікі так называлі гадоў з дзесятак) гэта ёсць бандыцкі захоп улады. Існуе шмат дакументаў, што Ленін зрабіў яго за нямецкія грошы, падмануўшы салдат, рабочых і селян лозунгамі: "Зямля – селянам! Фабрыкі – рабочым! Мір – народам!" Нічога гэтага бальшавікі не выканалі. Паплечнікі Леніна стварылі таталітарную краіну, дзе не існаваў закон, а панавала партыйная мэтазгоднасць дзеля ўтрымання ўлады. Дзеля гэтага былі растраляны мільёны грамадзян, а дзесяткі мільёнаў рэпрэсіраваны і кінуты ў савецкія канцлагеры. Пра гэта дакументальна напісаў у свой час Аляксандр Салжэніцын у кнізе "Архіпелаг ГУЛАГ".

Сёння ніводная краіна з былога Саюза не вядзе свой адлік ад 1917 года. Гэта амаральна, гэта не па людскі. Расія, Украіна і г.д. шануюць сваю шматвекавую гісторыю і вучаць грамадзян яе паважаць.

На Беларусі, падаецца, пачатак вядзецца з Вялікай Айчынай вайны. Дакладней, ад лініі ката Сталіна. Якой у сапраўднасці на пачатак вайны і не было. Але гістарычная праўда не абцяжарвае існуючую ўладу. Галоўнае – гэту ўладу мацней трымаць. За кошт ігнаравання правоў і свабод грамадзян. Правоў грамадзян на свабодныя выбары, атрымання інфармацыі, пастаянную працу і г.д.

Але ад камуністычных часоў шчэ засталіся чыноўнікі, якія вядуць летапіс ад кастрычніцкага перавароту. Мусіць, яны маюць такое права – лічыць пачаткам сваёй улады бандыцкі пераварот у кастрычніку. Але яны не маюць ніякага маральнага, хрысціянскага права называць селян Гарадоччыны, што змагаліся з бальшавікамі ў 1918-1921 гадах бандытамі. Гаспадары, якія мелі мазолістыя рукі, якія жадалі забяспечыць свае сем'і ежай, даць дзеткам годную будучыню мелі поўнае права брацца за зброю. Брацца за зброю, каб бараніць сем'і, сваю зямлю ад прышлых бальшавікоў. Гэта былі мужныя людзі. Яны змагаліся за годнае жыццё па закону, а не камандах матроса Жэлезняка. За гэта іх растрэльвалі без суда і абароны карнікі з Віцебскага губчэка. Так завяршылі свой лёс грамадзяне Горкаўскай воласці Цімафей Новікаў і Іосіф Карныш; Стайкаўскай воласці - Улас Цімафееў; Цііёсцянскай воласці -- Сямён Лісіцын, браты Сяргей і Антон Балабанавы, Аляксандр Каганаў, Міхаіл Сураўнёў; Вышадскай воласці - Аляксандр Лапаценка, Арцём Кнуроў, Канстанцін Данілаў, Фёдар Гаўрыленка - былы суддзя ўчастка Гарадоцкага павета.

Хрысціянскі і чалавечы абавязак – ушанаваць памяць змагароў за Свабоду на Гарадоччыне. Нашчадкі названых грамадзян маюць поўнае права ганарыцца сваімі дзядамі і прадзедамі.

І ўлада, якая вядзе свой пачатак не ад бандыцкага перавароту, павінна па хрысціянску ўшанаваць памяць пацярпелых ад бальшавіцкага гвалту.

**Леанід Гаравы.**

# ЛІЧЫЦЬ ПАЎСТАНЦАЎ БАНДЫТАМІ

Пра гэта было заяўлена ідэолагам раёна актывісту Руху "За Свабоду!" Леаніду Аўтухову пад час сустрэчы з групай жыхароў в. Фралова.

30 кастрычніка адбылася сустрэча жыхароў в. Фралова з начальнікам ідэалагічнага аддзела Гарадоцкага райвыканкама Леанідам Пронiным, намеснікам старшыні Надзеяй Буруновай з нагоды калектыўнага звароту грамадзян з прапановай ушанаваць памяць змагароў за Свабоду, растраляных карнікамі губчэка ў 1918 годзе, памятным Крыжом ля в. Фралова. Ініцыятарамі звароту былі гарадоцкія актывісты Руху "За Свабоду!" Леанід Аўтухоў і Леанід Гаравы, якія ў звароце адзначалі, што настаў час прымірэння і трэба ушанаваць памяць гаспадароў зямлі гарадоцкай памятным Крыжом.

Але ні аб якім прымірэнні пад час сустрэчы супрацоўнікі райвыканкама гаворкі не вялі. Галоўны ідэолаг раёна Леанід Пронін, як у часы свайго камуністычнага мінулага, быццам і не зачынены райкам партыі, дзе ён працаваў да 1991 года, апавядаў вяскоўцам, што паўстанне паднялі не абураныя гаспадары, якіх гвалцілі прышлыя бальшавікі, а былі бандыты, кулакі, што пілі кроў у беднай басоты.

Заўвагі ініцыятараў прымірэння і ўшанавання памяці землякоў на тое, што ва ўсім свеце дана ацэнка гвалту бальшавікоў, што ў Расіі ( быццам жа саюзная краіна??) адзначаюць дзень прымірэнне ніякага значэння пакуль для мясцовых вертыкальшчыкаў не мела. Ідэолаг раёна заяўляў пра тое, што бачыць у гэтым палітычны падтэкст, што гэта парушае стабільнасць у раёне, штурхае на шлях Прыбалтыкі і Украіны.

Мясцовым селянам такія палымяныя прамовы былі ў навіну. Жыхары і так шануюць памяць сваякоў, якіх растраляны карнікі з Віцебскага губчэка ў 1918 годзе.

Напрыканцы сустрэчы старшыня мясцовага сельсавета зачытаў ліст, подпісы пад якім збіраў перад сустрэчай, аб тым, што вяскоўцы не зразумелі ініцыятывы аб ушанаванні памяці змагароў за свабоду Крыжом і таму зараз не ўхваляюць гэту ініцыятыву. Відавочна, што калі б была магчымасць сабраць подпісы пад зваротам аб растрэле ініцыятараў прымірэння, то і пад такім лістом сабралі б подпісы.

Трэба таксама адзначыць "прыкольную" аргументацыю Леаніда Проніна аб тым, што жыхары в. Фралова і в. Дуброва, якія ставілі подпісы пад зваротам не разумеюць дзяржаўную беларускую мову і таму не ведалі за, што падпісваліся. Адным словам – жыхары вёскі непісьменныя, цёмныя людзі, якія зусім пазбавіліся сваіх каранёў і не ведаюць сэнса роднай мовы. Застаецца толькі у Гарадоцкім раёне правесці рэферэндум аб адмене дзяржаўнасці беларускай мовы.

**Леанід Гаравы.**

# Ушанаваць памяць ахвяр

Каля 100 грамадзян Гарадоччыны звярнуліся з прапановаў усталяваць Крыж памяці аб гаспадарах зямлі гарадоцкай, якіх растраляла Віцебскае губчэка ў лістападзе 1918 г. У звароце пішацца:

"У лістападзе 1918 года на Гарадоччыне адбылося антыбальшавіцкае паўстанне. Гаспадары зямлі Гарадоцкай узяліся за зброю, каб адстаяць сваё права быць гаспадарамі на роднай зямлі. Паўстанне было падаўлена карным атрадам Віцебскага губчэка, які растраляў 12 удзельнікаў паўстання. Пра гэта маюцца дакладныя архіўныя матэрыялы і аб гэтым напісана ў кнізе "Памяць" Гарадоцкага раёна.

У 2007 годзе дэмакратычны актывіст Леанід Аўтухоў вырабіў і ўсталяваў Крыж ля в. Фралова ў памяць аб загінуўшых змагарах за Свабоду. Крыж быў асвечаны святаром, але злачынцы яго знішчылі. На жаль, супрацоўнікі Гарадоцкага РАУС не здолелі раскрыць гэтае злачынства і знайсці святы Крыж.

Сёння настаў час ушанаваць памяць нашых землякоў, якія загінулі ў 1918 годзе, пратэстуючы супраць гвалту бальшавікоў. Усталяванне Крыжа змагарам за Свабоду на Гарадоччыне будзе сведчыць, што мы сталі на шлях прымірэння і шанавання памяці нашых землякоў. Крыж ля в. Фралова можа стаць мемарыяльным знакам, які будзе выклікаць павагу да нашай гістарычнай мінуўшчыны.

Заклікаем Вас прыняць захады для ўсталявання і асвячэння Крыжа Памяці ля в. Фралова ў лістападзе 2008 г. з нагоды 90-годдзя трагічных падзей антыбальшавіцкага супраціву на Гарадоччыне.

Гатовы сабраць народныя ахвяраванні дзеля гэтай высокароднай справы – ўшанавання памяці нашых землякоў."

Ці здолее старшыня Гарадоцкага райвыканкама стаць вышэй бальшавіцкіх забабонаў пакажа бліжэйшы час. Але актывіст Аўтухоў мае намер ушанаваць ахвяр бальшавіцкага рэжыму святым Крыжом памяці. І лічыць, што ўсе яны былі змагарамі за СВАБОДУ.

# Калектыўны зварот жыхароў



33 жыхара патрабуюць ад старшыні Гарадоцкага райвыканкама А.Мароза забяспечыць бесперашкодны з'езд з вул. Касаб'янава на вул. Дыдышка.

Актывіст Руху №За Свабоду!" Леанід Аўтухоў выступіў ініцыятарам звароту да старшыні Гарадоцкага райвыканкама Анатоля Мароза з калектыўным зваротам аб прыняцці мер для забеспячэння бесперашкоднага з'езда з вул. Касаб'янава на вул. Дыдышка. Зварот выкліканы тым, што на працягу апошніх трох гадоў гравійная частка дарогі на з'ездзе з вул. Дыдышка стала ніжэй асфальтавага пакрыцця. Асфальт стаў бар'ерам для руху транспарта і пешаходаў. Нягледзячы на існаванне адказных асоб з ГРУП ЖКГ "Гарадок" і ДАІ за бяспеку руха ніякія меры для выпраўлення становішча не прымаліся за апошнія гады. Фактычна нанесены на мапу з'езд не функцыянуе, бо нясе небяспеку пашкоджання транспарта ды можа выклікаць паломку аўтамашыны або веласіпеда, а таксама прывесці да траўмы неабачлівага веласіпедыста або пешахода.

Такое становішча супярэчыць патрабаванням кіраўніка краіны да бяспецы руха. Жыхары спадзяюцца, што старшыня райвыканкама Анатоль Мароз не будзе абаякавы да іх звароту.

Старшыня райвыкнкама аператыўна прарэагаваў на зварот. Праз тры дні спуск быў заасфальтаваны. Гэта добры прыклад для грамадзян з іншых вуліц Гарадка, якія гадамі чакаюць, калі ліквідуюць міні-возеры ля іх дамоў.

## АБ'ЯВА

***Запрашаем неабыякавых грамадзян да супрацоўніцтва. Вашы ідэі, нататкі, думкі будуць змешчаны на старонках "Гасцінца", як ад вашага імя, так і пад псеўданімам. Найбольш актыўных чытачоў чакае навагодні сюрпрыз! Тэлефануйце, пішыце на адрас газеты "Гасцінец"***

***Калі парушаны вашы правы спажыўца, то даем эфектыўныя парады па абароне права і пошуку бясплатных юрыстаў. Звяртайцеся на адрас газеты "Гасцінец".***

# НЕСЧАСТНЫЙ МАЛЬЧИК

## Пацаненок в форме, которому отдают честь седые генералы. Это уже не смешно



Когда Лукашенко приезжал с младшим сыном Николаем на всякие «Славянские базары» и «Дожинки», это еще можно было стерпеть. Даже когда он поволок сына на Олимпиаду в Пекине, было жалко засыпающего и капризничающего от смены часовых поясов ребенка, но, в принципе, и заботливого папу можно было как-то понять. Но, кажется, Лукашенко просто потерялся в реальности. Когда, прилетев на саммит СНГ, он вышел по трапу самолета к встречающим с четырехлетним ребенком возле колена, рухнула вся Киргизия. Когда вчера он появился на военных учениях с сыном, одетым в специально сшитый офицерский камуфляж, рухнула вся Беларусь.

Военные учения, на подготовку и организацию которых были затрачены миллионы долларов, превратилась в игру в солдатики для доморощенного крон-принца. Как результат: симпатичный мальчик с грустными глазами стараниями собственного папы становится монстриком, которого начинает ненавидеть вся Беларусь. Коля Лукашенко пока не понимает, чем сегодняшняя «причастность» к принятию важных решений обернутся для него в будущем. Но чем думает его папа?

Можно даже не сомневаться, что в окружении Лукашенко просто нет человека, который мог бы сказать ему простую фразу: так нельзя. Даже не потому, что Коля внебрачный сын, и публичные политики стараются не афишировать такие факты своей биографии. Так нельзя, потому что на наших глазах любящий папа калечит психику ребенка. Четырехлетний мальчик должен ходить в детский сад, заниматься и развлекаться со своими сверстниками, а не играть с малолетства в игру под названием «большая политика» с седовласыми дедами и президентской охраной. Они, может, и неплохие люди, но каждому возрасту - своя компания.

Так нельзя! Потому что завтра детей, внуков, жен, тещ, любовниц поволокут во власть те, кто рангом пониже. Потому что цепная реакция начинается с самого верха и остановить нашествие этой саранчи не сможет даже самый всесильный президент. Хотя сегодня ему очень нравится выглядеть царем, самодержцем, всемогущим волшебником в наивных глазах четырехлетнего сына.

Так нельзя! Потому что важные государственные мероприятия лидер страны не может и не должен превращать в забаву для своего малолетнего чада. Это не просто нескромно и непорядочно. Это несдержанное и неприкрытое самодурство!

Так нельзя! Потому что это дискредитация государства. (Не Лукашенко лично, а всей Беларуси). Никто не будет воспринимать серьезно страну, в которой министр обороны командует потешным войском перед мини-главнокомандующим, а министр иностранных дел стоит во фрунт в ожидании, пока «наследник» своими маленькими ножками спустится по трапу самолета. Мне очень запомнилось фото из Бишкека. На нем Сергей Мартынов будто отворачивается от старшего и младшего Лукашенко и умоляюще смотрит в объектив фотокамеры: «Не снимайте!» Сергей Николаевич, а слабо доложить Лукашенко, что его неудержная любовь к младшему сыну шокирует весь мир?! И не надо стыдливо отводить глаза, глядя на явление миру белорусского правителя с наследником, надо просто объясните Лукашенко, что любовь, как и вера, не бывает демонстративной и публичной.

Несчастный мальчик! Бедная его мама!

**Светлана КАЛИНКИНА,**
**«Белорусский партизан».**

# КІРАВАЦЬ ПАЛАТАЙ БУДУЦЬ

## рэгіянальныя "вэртыкальнікі"

Старшынём Палаты прадстаўнікоў чацьвёртага скліканьня абраны 59-гадовы Ўладзімер Андрэйчанка. Дагэтуль ён ачольваў Віцебскі аблвыканкам. Ягоным намесьнікам стаў 53-гадовы Валеры Іваноў, які раней працаваў старшынём Шклоўскага райвыканкаму.

Абедзьве кандыдатуры абраныя на безальтэрнатыўнай аснове.

За кандыдатуру Ўладзімера Андрэйчанкі пры патаемным галасаваньні выказаліся 107 дэпутатаў. Адзін выказаўся супраць, а яшчэ адзін бюлетэнь прызналі несапраўдным.

Новы сьпікер заявіў: галоўнае ў заканатворчым працэсе на бліжэйшыя чатыры гады вызначыў Аляксандар Лукашэнка — ствараць якасныя законы. Зыходзячы з гэтага, спадар Андрэйчанка сфармуляваў перад Палатай наступную трыяду: "Нам неабходна так весьці заканатворчую працу, каб яна, па-першае, мацавала і цэмэнтавала беларускую дзяржаўнасьць, пераводзіла на мову законаў прыярытэты ўнутранай і зьнешняй палітыкі Беларусі; па-другое, каб была прагматычнай, зыходзіла з жыцьцёвых рэаліяў; і, па-трэцяе, увасабляла ў канкрэтныя заканадаўчыя рашэньні інтарэсы і чаканьні людзей".

Тое, што менавіта Ўладзімер Андрэйчанка стане новым сьпікерам Палаты, на сайце "Белорусский партизан" прагназавалі яшчэ чатыры месяцы таму. Аглядальніца гэтага сайту Сьвятлана Калінкіна кажа: сёньняшняе абраньне толькі пацьвярджае, што "ў нас добрыя крыніцы інфармацыі. Мы даведаліся пра тое, што Андрэйчанка сыходзіць з губэрнатарскай пасады, тады, калі яшчэ нават не было вядома, ці будзе ягонае прозьвішча ў сьпісе кандыдатаў у дэпутаты. Наколькі мы ведаем, ва ўльтыматыўнай форме Андрэйчанку прапанавалі новую пасаду. І, наколькі я ведаю, да апошняга рабіўся выбар паміж ім і намесьнікам кіраўніка прэзыдэнцкай адміністрацыі спадаром Папковым. Але зараз мы ўжо ведаем, на карысьць каго ён зроблены".

Кандыдатуру Валерыя Іванова на пасаду віцэ-сьпікера прапанаваў Уладзімер Андрэйчанка. Вынікі патаемнага галасаваньня наступныя: "за" — 105 дэпутатаў, "супраць" — 4. Аналітыкі зьвярнулі ўвагу на тое, што ў кіраўніцтве новай Палаты прадстаўнікоў няма сталічных чыноўнікаў. Іхныя месцы занялі людзі з рэгіёнаў.

Аляксандар Фядута, які мае досьвед працы ва ўладных структурах, тлумачыць гэта так:

"Кіраўнічая эліта, на мой погляд, кансалідуецца напярэдадні вельмі цяжкіх часоў. Зразумела, што ў эканоміцы будзе адбывацца нешта, што не зусім спрыяе палітычнай сытуацыі. Таму трэба абапірацца на людзей, якія ведаюць, што адбываецца ў рэгіёнах".

# «ПАЛАТКУ» ЗАПОМНЯТ ПО ОДИОЗНЫМ ЗАКОНАМ

Если судить о работе народных избранников только по количественным параметрам, то «депутатов» можно назвать ударниками законодательного труда. «Палаточники» третьего созыва рассмотрели более 460 различных документов, пишет газета «Завтра твоей страны».

Но при детальном изучении законотворческой «продукции» выяснилось, что значительную ее часть (почти 35 составляют различные международные соглашения, которые требовалось только ратифицировать. Всего за четыре года депутаты одобрили почти 160 таких документов.

Вообще «палаточники» третьего созыва проявляли поразительное единодушие во взглядах и мнениях. Законопроекты, как правило, принимались в первом чтении почти единогласно, без жарких дебатов и даже дискуссий. А уж отклонение какихлибо документов было явлением чрезвычайно редким.

В истории «палаты представителей» третьего созыва было всего лишь три таких случая. Так, при повторном рассмотрении были отклонены предложения Александра Лукашенко об установлении ответственности за отказ от предоставления декларации о доходах, совминовский проект закона об основах судебно-экспертной деятельности и инициатива депутата Виктора Кучинского, который пытался внести поправки в Закон «О Комитете государственного контроля РБ».

Правда, такую «несговорчивость» «депутаты» проявили только на самом раннем этапе законотворческого пути – во время первых двух сессий. После чего в Овальном зале царствовал всеобщий «одобрямс» и апатия. Сами «парламентарии» редко выступали инициаторами законопроектов. За четыре года ими были внесены четыре законопроекта. Вышеупомянутую инициативу Виктора Кучинского отклонили, а три другие «продукта» депутатского законотворчества были приняты. В частности, «палаточники» утвердили свои поправки в Трудовой кодекс, изменения в документы по оценке стоимости объектов гражданского права и приняли Закон «О государственной поддержке и государственных гарантиях инновационной деятельности в Республике Беларусь».

Остальные проекты законов разрабатывало правительство и администрация белорусского правителя. Наибольшую инициативность администрация Александра Лукашенко проявила за эти четыре года в совершенствовании Уголовного кодекса и Кодекса административных правонарушений. «Депутаты» дружно голосовали за предложения Лукашенко по усилению ответственности за коррупцию и нарушение правил охоты и рыболовства, за внесение изменений в Банковский кодекс и в законодательство по подоходному налогу с физических лиц.

Сам Лукашенко обитателей Овального зала особо не беспокоил. Он обращался в «парламент» в основном лишь для утверждения проектов законов по новому бюджету или отчетов по предыдущему, а также при необходимости проведения очередной амнистии.

Впрочем, чиновники правительства и администрации Александра Лукашенко тоже не перетруждались на законотворческой ниве. Большинство разработанных ими за последние четыре года нормативных актов – это изменения или дополнения в действующие законы. Были случаи, когда «депутатам» одного созыва по несколько раз приходилось менять один и тот же закон. Например, Закон «Об электросвязи», принятый в июне 2005 года, через 2 года претерпел изменения. Закон «О рекламе», утвержденный в апреле 2007 года, уже в июне 2008 года был существенно подкорректирован. В некоторые акты на протяжении этих четырех лет парламентарии с подачи правительства и администрации Лукашенко вносили изменения более трех раз.

И все же этот безликий и инертный «парламент» останется в истории Беларуси. Его запомнят по одиозным законам, отменившим льготы, регулирующим правила орфографии белорусского языка, деятельность СМИ, политических партий и общественных объединениях. А хорошими делами уходящим «депутатам», увы, прославиться не удалось.

# «Тыя "Дзяды" – факт нацыянальнай гісторыі, разуменьня сябе як народу»




30 кастрычніка спаўняецца 20 гадоў першай масавай акцыі ў гонар Дня памяці продкаў "Дзяды", якія былі гвалтоўна разагнаныя. Успамінае архіёляг Валянціна Вяргей.

"Мяне вельмі ўразіла на "Дзяды" колькасьць людзей, якіх я ня ведала. Калі напярэдадні на ўтварэньні "Мартыралёгу" мы зьбіраліся ў касьцёле, то я там значную частку людзей ведала. А тут... Нават не памятаю, з кім я была. Адчуваньне зараз, што я была адна, без знаёмых ў тым натоўпе.

Запомніла гэтыя вялікія машыны з вадамётамі – гэта было ўпершыню і ўспрымалася вельмі сёр'ёзна. Але дзіўна, што страху нейкага не было. Проста натоўп расьсеклі гэтай "сьвіньнёй", натоўп стаў больш шчыльным па баках, а потым пачаў разыходзіцца. Скажу нават, што ўцёкаў не было. Памятаю, як перайшла праз вуліцу па пераходзе, не ўцякала.

Была надзея нейкая, што пачнуцца перамены ў жыцьці краіны і тваім жыцьці. Што гэтая магутная машына не заўсёды можа спраўляцца, нешта пачне адбывацца і прывядзе да кардынальных зьменаў.

Тыя "Дзяды" – факт нацыянальнай гісторыі, разуменьня сябе як народу, беларускага народу. І можа быць яшчэ разуменьне таго, што тыя савецкія ўлады, як і пасьлясавецкія, абсалютна не ўспрымаюць тое, што зьвязана з нацыянальнымі традыцыямі, з адраджэньнем народу".

**Алег Грузьдзіловіч.**

**Заснавальнік і рэдактар:**
Леанід Гаравы

**Адрас рэдакцыі:** 211573, г. Гарадок,
вул. Гагарына, д.30Б, кв.16.
Тэл. 8-02139-4-42-52. E-mail: haravy@tut.by

**Наклад: 290 асобнікаў.**
Выдаецца пры падтрымцы сяброў.
Распаўсюджваецца бясплатна.